ецца і клуб парашутыстаў, які вырасціў нямала класных майстроў. Ніводнае агульнагарадское свята не абыходзіцца без іх.

Любячы і шануючы сваю малую радзіму, жыхары Мазыршчыны ў думках і справах імкнуцца ў будучыню. Усё, што назапашана гістарычным вопытам і мудрасцю далёкіх продкаў, бацькоў і дзядоў, мы не толькі захаваем, але і абавязкова памножым.

*І. Замулка,*
старшыня гарвыканкама,

*М. Саўчык,*
старшыня райвыканкама

# Храналогія гісторыі Мазыра і Мазырскага раёна

| | |
|---|---|
| 35—10 тысяч гадоў назад | Эпоха верхняга палеаліту, станаўленне чалавека сучаснага вобліку. З'яўленне першага чалавека на Мазыршчыне. |
| 9—5 тысячагоддзе да н. э. | Эпоха мезаліту. Першае пасяленне чалавека на тэрыторыі Мазырскага раёна. |
| Канец 5-га — 3-е тысячагоддзе да н. э. | Эпоха неаліту — паселішчы чалавека на Прыпяці, каля вёсак Лубня, Загорыны. |
| Канец 3-га тысячагоддзя — 8—7 ст. да н. э. | Бронзавы век на тэрыторыі Мазыршчыны. Пасяленне Зарубінецкай і Мілаградскай археалагічнай культуры. |
| 2—1,5 тысячагоддзе да н. э. | Першае пасяленне на тэрыторыі Мазыра (вул. Гогаля). |
| 7—6 ст. да н. э. | Пачатак жалезнага веку на тэрыторыі Мазыршчыны. |
| 6—9 ст. н. э. | Пераход насельніцтва да феадальнага ладу. |
| 9—10 ст. н. э. | Пасяленні дрыгавічоў на тэрыторыі Мазыршчыны (г. Мазыр, вёскі Акулінка, Стрэльск, Барыскавічы, Слабада, Ясенец, Скрыгалаў, Глініца, Махнавічы, Надаткі і інш.). |
| 10—13 ст. н. э. | Эпоха Тураўскага княства. |
| 1155 г. | Першыя летапісныя звесткі пра Мазыр. |
| 1170 г. | Бітва пад Мазыром між князямі Давыдам Расціслававічам і Міхаілам Юр'евічам. |
| 1174 г. | Мазыр захоплены літоўскім князем Скірмундам. |
| Каля 1130—1192 гг. | Гады жыцця Кірылы Тураўскага. |
| XII ст. | Першыя дакументальныя ўпамінанні аб в. Скрыгалаў. |
| 1227 г. | Першае з'яўленне пад Мазыром татара-манголаў. |
| 1240 г. | Літоўскі князь Ердвіл разбіў каля Скрыгалава татара-мангольскіх заваёўнікаў. |
| 1241 г. | Мазыр захоплены і спалены татара-манголамі. |
| 1259 г. | Разгром захопнікаў Мазыра, іх паражэнне на р. Акунёўка. |
| 1267 г., 1275 г., 1315 г. | Набегі золатаардынскіх ханаў на літоўскія землі. |
| 40-я гады XIV ст. | Канчатковае ўваходжанне Мазыршчыны ў склад Вялікага княства Літоўскага. |
| 1413 г. | Мазыр становіцца павятовым цэнтрам Мінскага ваяводства. |
| Каля 1432 г. | Першыя ўпамінанні пра вёскі Міхалкі, Барбароў. |
| 1497 г. | Аблога Мазыра войскам крымскіх татар. |
| 7 мая 1497 г. | Забойства ў Скрыгалаве крымскімі татарамі мітрапаліта Кіеўскага і Усея Русі Макарыя. |
| 1506 г. | Мяцеж М. Глінскага і ўзяцце ім Мазыра. |
| 1509 г. | Першае ўпамінанне пра Мазырскі замак. |
| 1515 г. | Першае ўпамінанне пра в. Прудок. |
| 1521 г., 1534 г. | Набегі на Мазыр і яго ваколіцы крымскіх татар. |
| 1536 г. | Разбурэнне Мазыра трэцяй маскоўскай раццю пад кіраўніцтвам Ф. Аўчыны — Целяпнёва — Абаленскага. |
| 1568 г. | Першыя ўпамінанні пра в. Мялешкавічы. |
| 1566—1569 гг. | Уваходжанне Мазыра ў склад Кіеўскага ваяводства. |
| 1577 г. | Атрыманне Мазыром поўнага Магдэбургскага права. |
| 1592 г. | Суд Галоўнага літоўскага трыбунала над Стэфанам Лованам, мазырскім земскім суддзёй, абвінавачаным у матэрыялізме і атэізме, вальнадумстве. |
| 1601 г. | Вялікі пажар у Мазыры, які знішчыў замак. |
| 1609 г. | Зацверджаны герб Мазыра. |

| | |
|---|---|
| Кастрычнік 1615 г.—1616 г. | Бунт гараджан Мазыра супраць замкавай адміністрацыі. |
| 1645 г. | Заснаванне бернардзінскага манастыра ў Мазыры. |
| 1647 г. | Заснаванне жаночага каталіцкага манастыра ордэна марнавітак. |
| 20 студзеня 1649 г. | Антыфеадальнае паўстанне гараджан Мазыра і сялян навакольных вёсак. Гераічная абарона горада. Штурм і знішчэнне горада войскамі Радзівіла. |
| 1676 г. | Апошняе ўпамінанне пра Мазырскі замак. |
| 1736—1761 гг. | Антыфеадальныя выступленні сялян Мазырскага павета. |
| 1744—1745 гг. | Заснаванне ў Мазыры жаночага каталіцкага манастыра ордэна цыстэрцыянцаў па вул. Гогаля (помнік архітэктуры барока). |
| 1750 г. | Адкрыццё ў Мазыры езуіцкай школы. |
| 1756 г. | Паўстанне мазырскіх сялян супраць польскіх феадалаў. |
| 1772 г. | Адкрыццё ў Мазыры ніжэйшай трохкласнай школы. |
| 1793 г. | Пераход Мазыршчыны ў склад Расійскай імперыі. |
| 1794 г. | Высылка ў Салавецкі манастыр Язэпа Яленскага, ураджэнца Мазыршчыны, асветніка, бунтара супраць прыгоннага права, педагога і мысліцеля. |
| 1799 г. | Трохкласная ніжэйшая школа ў Мазыры пераўтворана ў павятовую школу. |
| 1800 г. | Складзены геаграфічны атлас Мінскай губерні, дзе ўпершыню дадзена падрабязная характарыстыка Мазыра і яго ваколіц. |
| 1803 г. | Пераўтварэнне павятовай школы ў вучылішча. |
| 1812 г. | Удзел насельніцтва Мазыршчыны ў баявых дзеяннях супраць французскай арміі. Корпус генерала Эртэля ў Мазыры. |
| 1821 г. | Адкрыццё ў маёнтку в. Барбароў школы для дзяцей сялян. |
| 30 красавіка 1828 г. | Праезд праз Мазыр імператара Расіі Мікалая І з сям'ёй. |
| 1831 г. | Удзел мазырскай шляхты і каталіцкага насельніцтва пад кіраўніцтвам Ф. Кяневіча ў паўстанні супраць расійскага панавання і за аднаўленне Рэчы Паспалітай. |
| 1835 г. | Адкрыццё першага аднакласнага прыходскага вучылішча ў Мазыры. |
| 1850 г. | На Прыпяці з'явіўся першы параход «Вісла». |
| 1853—1857 гг. | Падарожжа па Беларусі П. М. Шпілеўскага, беларускага этнографа, пісьменніка, публіцыста, апісанае ў некалькіх ягоных кнігах, у т. л. і «Мазыршчына». |
| 1855 г. | Адкрыты ў Мазыры чатырохкласны жаночы пансіён. |
| 1859 г. | Адкрыццё ў Мазыры мужчынскай гімназіі — першай на Палессі сярэдняй навучальнай установы. |
| Сярэдзіна XIX ст. | Пабудова ў в. Барбароў палаца і пейзажнага парку на плошчы 5 га. |
| 1863 г. | Хваляванні сярод шляхты і каталіцкай часткі жыхароў Мазыршчыны ў падтрымку паўстання ў Польшчы і Беларусі пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага. |
| 6 чэрвеня 1864 г. | Пакаранне смерцю ў г. Казань ураджэнца Мазыра Іераніма Кяневіча — аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863 г. |
| 1863—1865 гг. | Адкрыццё народных вучылішчаў для дзяцей сялян у мястэчку Скрыгалаў, вёсках Мялешкавічы, Барбароў, Сідзельнікі, Міхалкі, Слабада. |
| 1865 г. | Асвяшчэнне сабора св. Міхаіла ў Мазыры. |
| 1 сакавіка 1881 г. | Забойства ў Петраградзе членамі народніцкай арганізацыі «Народная воля» цара Аляксандра II, за якое была асуджана і ўраджэнка Мазыра Геся Гельфман. |
| 1889—1891 гг. | Работа на Палессі археалагічнай экспедыцыі беларускага археолага, прафесара У. З. Завітневіча (ваколіцы Мазыра, вёскі Скрыгалаў, Слабада, Барыскавічы, Надаткі і інш.). Даследаваны звесткі аб жыцці ў IX—XII стст. дрыгавічоў. |
| 1892 г. | Вялікі пажар у Мазыры. |
| 1894—1896 гг. | У Мазыры створана вольнае пажарнае таварыства. |
| 1895 г. | Заснаванне ў Мазыры запалкавай фабрыкі «Маланка» — першага прамысловага прадпрыемства. |
| Красавік 1896 г. | Першая забастоўка работніц мазырскай запалкавай фабрыкі «Маланка». |

| | |
|---|---|
| 1896 г. | Адкрыццё мазырскага піваварнага завода. |
| Май 1897 г. | Адкрыццё капліцы ў мястэчку Скрыгалаў і помніка на беразе возера — месцы забойства ў 1497 г. мітрапаліта Кіеўскага і Усея Русі Макарыя крымскімі татарамі. |
| 1899 г. | Пачатак дзейнасці ў Мазыры і на Палессі народніцкай арганізацыі «Трудовая воля». |
| 1900 г. | Заснавана Мазырская друкарня. |
| 26 кастрычніка 1902 г. | Створаны ў Мазыры гарадскі камітэт РСДРП. |
| 1902 г. | Адкрыццё ў Мазыры фабрыкі «Прыма». |
| Студзень 1904 г. | Першая палітычная стачка мазырскіх рабочых. |
| Май 1904 г. | Забастоўка рабочых Мазыра. |
| 25 студзеня 1905 г. | Данясенне памочніка начальніка Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў дэпартамент паліцыі аб стачцы фабрычных рабочых Мазыра. |
| 1 красавіка 1905 г. | Стачка рабочых запалкавай фабрыкі ў Мазыры. |
| 25 красавіка 1905 г. | Дэманстрацыя рабочых запалкавай фабрыкі. |
| 26 сакавіка 1905 г. | Забастоўка і дэманстрацыя рабочых у Мазыры. |
| 11 мая 1905 г. | Забастоўка і дэманстрацыя рабочых запалкавай фабрыкі «Маланка». |
| 27 мая 1905 г. | Забастоўка рабочых фанернай фабрыкі «Прыма». |
| 21 ліпеня 1905 г. | Дэманстрацыя моладзі і навучэнцаў гімназіі ў Мазыры. |
| 21 жніўня 1905 г. | Забастоўка батракоў у в. Дудзічы Мазырскага павета, хваляванні сялян вёсак Міхалкі, Прудок, Рудня. |
| 17—26 кастрычніка 1905 г. | Усеагульная кастрычніцкая палітычная забастоўка рабочых Мазыра. |
| 30 кастрычніка — 7 лістапада 1905 г. | Утрыманне ўлады Мазырскім рэвалюцыйным камітэтам, т. зв. «Мазырская рэспубліка». |
| 5 лістапада 1905 г. | Дэманстрацыя і ўзброеныя сутычкі рабочых з паліцыяй у Мазыры. |
| Сакавік 1906 г. | Байкот рабочымі запалкавай фабрыкі акцыянернага таварыства «Маланка» ў Мазыры. Выбары ў Дзяржаўную думу. |
| 19 студзеня 1907 г. | Лакаўт на запалкавай фабрыцы «Маланка». |
| 3 чэрвеня 1907 г. | Забастоўка рабочых фанернай фабрыкі «Прыма». |
| 1907 г. | Першы прыём навучэнцаў у Мазырскую рамесную школу. |
| 1907 г. | Адкрыццё чатырохкласнага начальнага вучылішча ў Мазыры. |
| 1911 г. | Адкрыццё ў Мазыры жаночай гімназіі. |
| Студзень, сакавік 1914 г. | Забастоўкі рабочых у Мазыры. |
| 1 жніўня 1914 г. | Уступленне Расіі ў першую сусветную вайну. Масавая мабілізацыя жыхароў Мазыршчыны на фронт. |
| Жнівень, верасень 1914 г. | Хваляванні мабілізаваных на вайну сялян. 60 удзельнікаў асуджаны ваенна-палявымі судамі. Тры чалавекі за разгром маёнтка ў в. В. Бокаў павешаны 18.12.1914 г. |
| 1915 г. | Пабудаваны завод «Кіпратэх» на ст. Мазыр (цяпер дрэваапрацоўчае аб'яднанне). |
| 1915 г. | Пабудаваны развадны мост цераз Прыпяць. |
| Ліпень 1915 г. | Забастоўка рабочых фанернай фабрыкі «Прыма» з патрабаваннем павысіць аплату працы. |
| 1916 г. | Пабудаваны чыгуначны мост цераз Прыпяць і чыгунка Калінкавічы — Корасцень. |
| Люты 1917 г. | Сходы і мітынгі жыхароў Мазыршчыны з выпадку Лютаўскай рэвалюцыі ў Петраградзе. |
| Сакавік 1917 г. | Утварэнне Мазырскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. |
| Красавік 1917 г. | Утварэнне валасных Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мазырскага павета. |
| 8 красавіка 1917 г. | Прынята рашэнне Мазырскага Савета аб увядзенні 8-гадзіннага рабочага дня. |
| 29 красавіка 1917 г. | Адбыўся 1-шы з'езд сялян Мазырскага павета. Прынята рашэння аб перадачы ўсёй зямлі сялянам. |
| Красавік 1917 г. | Стварэнне аб'яднанай арганізацыі РСДРП у Мазыры. |
| Май 1917 г. | Пачала выходзіць газета «Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов». |
| Май 1917 г. | Створана бальшавіцкая ячэйка на фабрыцы «Маланка». |
| Май 1917 г. | Адбыўся 2-гі з'езд сялян Мазырскага павета. |
| Май 1917 г. | Сяляне в. Рудня Мазырскага павета прынялі рашэнне «бесплатно изъять помещичьи, монастырские, церковные, кабинетские и др. земли». |

| | |
|---|---|
| Чэрвень 1917 г. | Забастоўка рабочых лесапільна-фанернага завода Бермана ў Мазыры. |
| Чэрвень 1917 г. | Адбыўся 3-ці з'езд сялянскіх дэпутатаў павета. |
| 5—6 верасня 1917 г. | Адбыўся 4-ты з'езд сялянскіх дэпутатаў павета. |
| Верасень — кастрычнік 1917 г. | У Мазырскім павеце адбылося больш як 20 сялянскіх выступленняў з патрабаваннем перадачы сялянам памешчыцкіх, царкоўных і ўдзельных земляў. |
| 6—7 кастрычніка 1917 г. | Адбыўся 5-ты сялянскі з'езд Мазырскага павета, які прыняў рэзалюцыю аб канфіскацыі памешчыцкай зямлі. |
| 11 лістапада 1917 г. | Стварэнне Мазырскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, які ўзяў уладу і арганізаваў работу па стварэнні новага бальшавіцкага Савета. Пачатак устанаўлення Савецкай улады на Мазыршчыне. |
| Студзень 1918 г. | Стварэнне народнай міліцыі ў Мазыры. |
| Сакавік 1918 г. | Акупацыя Мазырскага павета нямецкімі і пятлюраўскімі войскамі. Увядзенне ваеннага становішча і акупацыйнага рэжыму. Актывізацыя бальшавіцкага падполля. |
| Лета — восень 1918 г. | Разгортванне партызанскага руху на Палессі, дзейнасць Слабадскога, Скрыгалаўскага і Мялешкавіцкага партызанскіх атрадаў. |
| 21 снежня 1918 г. | Перагаворы ў Мазыры прадстаўнікоў савецкага ўрада Д. З. Мануільскага, В. Р. Мянжынскага, Д. Гурэвіча з нямецкімі ўладамі аб аднаўленні Савецкай улады. З вялікай прамовай перад жыхарамі горада выступіў Мануільскі. Часці Чырвонай Арміі ўступілі ў горад. |
| Канец снежня 1918 г. | Улада ў Мазыры перайшла ў рукі пятлюраўскай дырэкторыі. Рэўкам пачаў падпольную дзейнасць. Актывізацыя падпольшчыкаў і партызан. |
| Снежань 1918 г. | У Мазыры створана камсамольская арганізацыя. |
| 31 снежня 1918 г.— 1 студзеня 1919 г. | Арганізацыя Саветаў у Мазырскім павеце. |
| 1 студзеня 1919 г. | Уваходжанне Мазыра і павета ў склад БССР. |
| 11 студзеня 1919 г. | Чырвоная Армія ўступіла ў Мазыр. Аднаўленне Савецкай улады ў павеце. Стварэнне камітэтаў беднаты ў вёсках, у в. Слабада — саўгаса. |
| 25 студзеня 1919 г. | Адбыўся першы сялянскі з'езд Мазырскага павета, які прыняў рашэнне — сабраць прадукты для галадаючага пралетарыяту Піцера і Масквы. |
| 30 сакавіка — 10 красавіка 1919 г. | Горад Мазыр і частку павета захапілі пятлюраўцы. Масавыя грабяжы і забойствы. Баі Чырвонай Арміі супраць дырэкторыі. |
| 11 красавіка 1919 г. | Адноўлена дзейнасць Мазырскага рэвалюцыйнага камітэта. |
| Красавік 1919 г. | Пачатак белапольскай акупацыі Палесся. Пагроза захопу Мазыра, яго абарона. |
| Ліпень — жнівень 1919 г. | Абарона Палесся. Фарміраванне Прыпяцкай ваеннай флатыліі, Мазырскага стралковага палка. |
| З 10 жніўня 1919 г. | У горадзе і павеце аб'яўлена асаднае становішча. |
| Верасень 1919 г.— сакавік 1920 г. | Баі на заходніх рубяжах Мазыршчыны. Многія вёскі некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. |
| 5 сакавіка 1920 г. | Белапалякі захапілі Мазыр. У баі з белапалякамі загінуў камісар брыгады 47-й дывізіі М. С. Данілеўскі, дзяржаўны і ваенны дзеяч Украіны. |
| Сакавік — чэрвень 1920 г. | Дзейнасць мазырскіх падпольшчыкаў і партызанскіх атрадаў Палесся. |
| 6 чэрвеня 1920 г. | Смяротныя пакаранні групы падпольшчыкаў польскімі ўладамі. |
| 29 чэрвеня 1920 г. | Вызваленне Мазыра ад белапольскіх захопнікаў войскамі беларуска-літоўскай Чырвонай Арміі. |
| 29 чэрвеня 1920 г. | Арганізавана Упраўленне мазырскай міліцыі. |
| 1 ліпеня 1920 г. | Вызваленне ад польскіх захопнікаў вёсак Слабада, Скрыгалаў, Казіміраўка. |
| 8 ліпеня 1920 г. | Вызваленне ад польскіх захопнікаў вёсак Асавец, Глініца. |
| 18 жніўня 1920 г. | Адбыўся з'езд валасных ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў Мазырскага павета, які прыняў рэзалюцыю аб аказанні падтрымкі Чырвонай Арміі ў барацьбе з белапольскімі акупантамі. |
| 1 верасня 1920 г. | У Мазыры адбылася канферэнцыя беспартыйных жанчын-сялянак. |
| 10 лістапада 1920 г. | Мазыр і павет захоплены бандамі С. Булак-Балаховіча. |

| | |
|---|---|
| 20 лістапада 1920 г. | Вызваленне Мазыра войскамі Чырвонай Арміі ад банд Булак-Балаховіча. |
| 25 снежня 1920 г. | Адбыўся з'езд работнікаў зямлі і лесу, дзе абмеркаваны задачы сельскагаспадарчай вытворчасці і лесаводства ў павеце. |
| 5 студзеня 1921 г. | Скасаванне павятовага і валасных ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў. Перадача ўлады мясцовым Саветам. |
| Май 1921 г. | У Мазыры пачала выходзіць мясцовая газета. |
| Снежань 1922 г. | Адбыўся 7-мы з'езд Саветаў Мазырскага павета, які абмеркаваў пытанні ўзнаўлення эканомікі. |
| 1922—1924 гг. | Стварэнне першых калектыўных гаспадарак валодання зямлёй: арцеляў «Сіла» (в. Прудок), «Чырвоная зорка» (в. Лешня), камуны «Міна» (в. Хамічкі), калгаса «Серп і молат» (в. Барбароў). |
| 3 лістапада 1922 г. | Адбыўся першы павятовы з'езд сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі. |
| 1922 г. | Пачатак работы аднаўленай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» (былая фабрыка «Прыма»). |
| 6 лістапада 1922 г. | Адбыўся сход сялян Слабадской воласці Мазырскага павета. |
| Сакавік 1923 г. | Адбылася 6-я павятова-гарадская партыйная канферэнцыя ў Мазыры. |
| Кастрычнік 1923 г. | Адбылася 7-я павятова-гарадская партыйная канферэнцыя ў Мазыры. |
| Снежань 1923 г. | Адбыўся 8-мы павятовы з'езд Саветаў. |
| 17 ліпеня 1924 г. | Ліквідаваны ў Беларусі паветы і воласці. Утворана Мазырская акруга і Мазырскі раён. |
| Лістапад 1924 г. | Створана ў Мазыры кавальская майстэрня (цяпер завод «Мазырсельмаш»). |
| 1925 г. | Пачала дзейнічаць Палеская пясчаная сельскагаспадарчая станцыя ў в. Скрыгалаў. |
| 1926—1927 гг. | Цэнтр раёна знаходзіўся ў в. Слабада. |
| 1926 г. | Адкрыццё ў Мазыры педагагічнага тэхнікума. |
| 9 чэрвеня 1927 г. | Пастанова ЦВК і СНК БССР аб узбуйненні Мазырскай акругі. |
| 1927 г. | Створана арцель па вырабе панчох (трыкатажная фабрыка). |
| 1928 г. | Створана арцель «Молат» у Мазыры. |
| 1 студзеня 1929 г. | Узнагароджанне ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР перадавых прадпрыемстваў — завода «Чырвоны Кастрычнік» і в. Мялешкавічы. |
| 1929—1932 гг. | У Мазыры пабудаваны клуб-тэатр (цяпер гарадскі будынак культуры) — помнік архітэктуры канструктывізму. |
| 1930 г. | Арганізавана машынна-трактарная станцыя ў в. Слабада. |
| 1932 г. | Адкрыццё першай у БССР транспартнай авіялініі Мінск — Глуск — Парычы — Мазыр. |
| 1932 г. | Пачалося будаўніцтва жылых дамоў у пас. Пхоў. |
| 1932 г. | Пераўтварэнне пясчанай станцыі ў в. Скрыгалаў у сельскагаспадарчы тэхнікум. |
| 25 сакавіка 1935 г. | Адкрыццё ў Мазыры калгасна-саўгаснага тэатра (у 1938—1941 гг. Палескі абласны драматычны тэатр). |
| 1936 г. | Пераўтварэнне сямігадовых школ у вёсках Слабада і Міхалкі ў сярэднія. |
| 1936—1938 гг. | Масавае перасяленне хутароў у вёскі. |
| 1936 г. | Пачаўся кругласутачны рух параходаў па Прыпяці. |
| 1937 г. | Адкрыццё ў Мазыры двухгадовай школы медсясцёр (цяпер медыцынскае вучылішча). |
| 15 студзеня 1938 г. | Утварэнне Палескай вобласці з цэнтрам — г. Мазыр. |
| 1939 г. | Створана ў Мазыры аб'яднанне «Мазырсельбуд». |
| 22 жніўня 1941 г. | Акупацыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі Мазыра і Мазырскага раёна. |
| Жнівень—кастрычнік 1941 г. | Дзейнасць Мазырскага партыйна-патрыятычнага падполля. |
| | Стварэнне і дзейнасць партызанскіх атрадаў (Мазырскага, Махнавіцкага і інш.). |
| Восень 1941 г.— зіма 1942 г. | Масавае знішчэнне мірных жыхароў Мазыршчыны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. |
| Студзень 1942 г. | Расстрэл групы мазырскіх падпольшчыкаў. |
| Верасень — снежань 1942 г. | Разгром асноўных сіл Мазырскага падполля. |
| 18 лістапада 1942 г. | Каля в. Барбароў цераз Прыпяць з баямі пераправіліся партызанскія злучэнні С. Каўпака, А. Сабурава |

| | |
|---|---|
| | і А. Фёдарава для арганізацыі ўсенароднай барацьбы з ворагам. |
| Люты 1943 г. | У лясах Мазыршчыны пачалася арганізацыя партызанскіх атрадаў. |
| 22 сакавіка 1943 г. | Знішчаны з насельніцтвам вёскі Казіміраўка (372 чал.), Буда Казіміраўская (131 чал.). |
| 25 красавіка 1943 г. | Сфарміраваны склад Мазырскага падпольнага райкама КП(б) Беларусі. |
| Май 1943 г. | Створаны падпольны райкам ЛКСМБ. |
| 4 чэрвеня 1943 г. | Разгром нямецкага гарнізона ў в. Скрыгалаў. |
| 5 чэрвеня 1943 г. | Знішчана фашыстамі в. Спрымачоў (больш за 100 чал.). |
| 30 чэрвеня 1943 г. | Знішчана з насельніцтвам фашыстамі в. Касцюковічы (162 чал.). |
| 30 жніўня 1943 г. | Знішчаны нямецкі гарнізон ў в. Шчакатава. |
| Лета і восень 1943 г. | Масавыя дыверсіі партызан на чыгунцы. |
| Верасень 1943 г. | Партызанскія атрады Мазыршчыны аб'яднаны ў Мазырскую партызанскую брыгаду імя Аляксандра Неўскага. |
| 8 студзеня 1944 г. | Пачатак Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі. |
| 9 студзеня 1944 г. | Вызваленне вёсак Іванкаўшчына і Мялешкавічы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. |
| 11 студзеня 1944 г. | Вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вёсак Скрыгалаў, Слабада, Барбароў, Прудок, Міхалкі. |
| 14 студзеня 1944 г. | Вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Мазыра. Мітынг на цэнтральнай плошчы ў гонар вызвалення. |
| 15 студзеня 1944 г. | Салют у Маскве ў гонар вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прысвоена найменне «Мазырскіх» 18 злучэнням і часцям 61-й арміі і 16-й паветранай арміі Беларускага фронту. |
| Студзень 1944 г. | Сфарміраваны кіруючыя партыйныя і камсамольскія органы, адноўлены мясцовыя Саветы, пачатак работы прадпрыемстваў, калгасаў і ўстаноў. |
| Студзень 1944 г. | Адноўлена работа хлебазавода і электрастанцыі. |
| 23 студзеня 1944 г. | Арцель «Молат» пачала даваць прадукцыю. |
| Люты 1944 г. | Урад Беларусі прыняў рашэнне аб адкрыцці ў Мазыры настаўніцкага інстытута. |
| Люты 1944 г. | Работа Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. |
| 19 красавіка 1944 г. | Выканкам гарадскога Савета прыняў пастанову аб аднаўленні жылога фонду і камунальных прадпрыемстваў. |
| 20 красавіка 1944 г. | Заснавана швейная фабрыка ў Мазыры. |
| Май 1944 г. | Прыезд прадстаўнікоў Ульянаўскай вобласці для дапамогі ў аднаўленні народнай гаспадаркі і культуры Мазыршчыны. |
| 1944 г. | Мазырская школа медсясцёр перайменавана ў фельчарска-акушэрскую. |
| 1945 г. | Пачата будаўніцтва рамонтна-экскаватарнага завода (цяпер МЗММ). |
| 1945 г. | Пабудаваны Мазырскі прамкамбінат (цяпер ВМА). |
| Май 1946 г. | Пушчана ў эксплуатацыю першая чарга Мазырскай ГЭС. |
| 1946 г. | Асвечаны Свята-Міхайлаўскі храм. |
| Кастрычнік 1947 г. | Заснавана ПТВ-68 будаўнікоў. |
| 1948 г. | Пачата будаўніцтва дрэваапрацоўчага камбіната. |
| 7 лістапада 1949 г. | Адкрыццё ў Мазыры краязнаўчага музея. |
| 1950 г. | Адноўлены даваенны ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці. Насельніцтва з зямлянак перасялена ў пабудаваныя дамы. |
| 1950 г. | Пачатак уз'яднання дробных калектыўных сельскіх гаспадарак. |
| Верасень 1952 г. | Пераўтварэнне Мазырскага настаўніцкага інстытута ў педагагічны інстытут імя Н. К. Крупскай. |
| 8 студзеня 1954 г. | Скасавана Палеская вобласць. Г. Мазыр і раён уключаны ў склад Гомельскай вобласці. |
| 1956 г. | Завершана ўз'яднанне дробных калектыўных сельскіх гаспадарак. |
| Май 1956 г. | Створана ў Мазыры фабрыка мастацкіх вырабаў. |
| 1958 г. | Пачалося будаўніцтва рачнога порта. |
| 1958 г. | Прынята рашэнне аб арганізацыі ў Мазыры завода «Мазыркабель». |

| | |
|---|---|
| Кастрычнік 1959 г. | Атрымана першая прадукцыя на заводзе «Мазыркабель». |
| Снежань 1958 г. | Адкрыўся рух па жалезабетонным мосце цераз р. Прыпяць. |
| 1960 г. | Створаны саўгас «Мазырскі». |
| Снежань 1962 г. | Узбуйненне Мазырскага раёна. Далучана 28 населеных пунктаў. |
| 1962 г. | Створаны Мазырскі лясгас. |
| 1963 г. | Пачаты работы па праектаванні ў Мазыры нафтаперапрацоўчага завода. |
| 19 лістапада 1963 г. | Заснаваны Мазырскі політэхнічны тэхнікум. |
| 1964 г. | Створаны саўгас «Каменка». |
| 1964 г. | Кабельны завод выйшаў на праектную магутнасць. |
| 1964 г. | Пабудаваны корпус фабрыкі мастацкіх вырабаў. |
| Снежань 1964 г. | Закончана будаўніцтва буйнейшага ў БССР рачнога порта Пхоў. Цяпер порт Мазыр. |
| 1965 г. | Створана Мазырская міжкалгасная будаўнічая арганізацыя (цяпер МПМК-105). |
| 1965 г. | Пачаў працаваць у Мазыры малочны завод. |
| 1966 г. | Заснавана ў Мазыры ГПТВ-84. |
| 1969 г. | Адкрыццё ў Мазыры музычнага вучылішча. |
| 1970 г. | Сфарміравана дырэкцыя і пачата будаўніцтва ЦЭЦ. |
| 14 студзеня 1970 г. | Створаны ў Мазыры трэст № 6 «Мазырнафтахімбуда» (цяпер КПФ «Трэст № 6»). |
| 1971 г. | Пачата будаўніцтва нафтаперапрацоўчага камбіната. |
| 1971 г. | Узнагароджанне МПМК-105 ордэнам «Знак Пашаны». |
| 1971 г. | Пачата будаўніцтва мікрараёна НПЗ. |
| 1971 г. | Створана вытворчае дрэваапрацоўчае аб'яднанне «Мазырдрэў». |
| 1971 г. | Мазырскі прамкамбінат пераўтвораны ў мэблевы. Створана мэблевае аб'яднанне. |
| 1972 г. | Узведзены новы будынак бібліятэкі імя Пушкіна. |
| 1972 г. | Уведзена ў эксплуатацыю 1-я чарга завода зборнага жалезабетону № 12. |
| 1973 г. | Узведзены новы будынак швейнай фабрыкі. |
| 1973 г. | У в. Ляхаўцы створана Мазырская птушкафабрыка. |
| 14 студзеня 1974 г. | Пуск ЦЭЦ у Мазыры, першая турбіна магутнасцю 60 тыс. квт. дала ток. |
| 1974 г. | Пачата будаўніцтва трамвайнай лініі ў г. Мазыры. |
| 1974 г. | Узведзены будынак аўтавакзала. |
| 1974 г. | Пачата будаўніцтва солевыварачнага камбіната. |
| 1975 г. | На СВК прабурана першая свідравіна. |
| 30 студзеня 1975 г. | Пуск 1-й чаргі Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. |
| 31 студзеня 1975 г. | Атрыманы першы палескі бензін. |
| 1975 г. | Завод «Мазырсельмаш» атрымаў назву завод «Мазырптушкамаш». |
| 1975 г. | Створана міжгаспадарчае прадпрыемства па вытворчасці кармоў «Прыпяць». |
| 1975 г. | Пабудаваны корпус цэха мантажных правадоў завода «Мазыркабель». |
| 1975 г. | Пушчана ў эксплуатацыю другая турбіна на Мазырскай ЦЭЦ магутнасцю 130 тыс. квт. |
| 1975 г. | Прынята пастанова аб будаўніцтве завода кармавых дрожджэй (ЗКД). |
| 1976 г. | Арганізавана ГПТВ-131. |
| 1976 г. | Узведзены новы будынак палітэхнікума. |
| 1976 г. | Перабазіравана з суседняга раёна ў пас. Крынічны Палеская сельскагаспадарчая доследная станцыя. |
| 1976 г. | Створана ў пас. Крынічны эксперыментальная база «Крынічная». |
| 1976 г. | Адкрыццё ў в. Гурыны раённай карцінная галерэі — філіяла Беларускага Дзяржаўнага мастацкага музея. |
| 1977 г. | Узведзены мемарыяльны комплекс Курган Славы. |
| 1978 г. | Узведзены новы будынак аэрапорта ў Мазыры. |
| 1979 г. | Пабудаваны санаторый-прафілакторый трэста № 6 на 100 ложкаў. |
| 1979 г. | Пачата будаўніцтва ЗКД з удзелам дзяржаў СЭУ. |
| 1979 г. | У Мазыры пабудаваны бальнічны комплекс. |
| 1980 г. | Узведзены новы будынак медвучылішча. |
| 1981 г. | На НПЗ атрыманы першы парафін. |
| 2 снежня 1982 г. | На Мазырскім заводзе па вытворчасці солі (СВК) атрымана першая соль. |
| 1982 г. | Узведзены новы будынак Мазырскага педагагічнага інстытута. |

| | |
|---|---|
| 1982 г. | Пабудаваны рачны вакзал. |
| 30 снежня 1983 г. | Атрымана першая прадукцыя на ЗКД. |
| 1983 г. | Пачата будаўніцтва моста цераз Прыпяць каля в. Навікі. |
| 1984 г. | Адкрыццё ў Мазыры кінатэатра «Мір». |
| 1984 г. | Узведзены новы будынак музвучылішча. |
| 1984 г. | Пабудавана стаматалагічная паліклініка ў Мазыры. |
| 30 снежня 1985 г. | Атрыманы першыя гранулявaныя дрожджы на ЗКД. |
| 1985 г. | Рэканструявана цэнтральная плошча імя У. І. Леніна. |
| 1986 г. | Пачата будаўніцтва Палаца культуры НПЗ. |
| 1986 г. | Створана ПТВ-228 хімікаў. |
| 1986 г. | Створаны завод па рамонце бытавой тэлеапаратуры. |
| 26 красавіка 1986 г. | Аварыя на Чарнобыльскай АЭС, у выніку якой Мазыр і вёскі Мазырскага раёна аказаліся забруджанымі радыенуклідамі. |
| 1987 г. | На праектную магутнасць выйшаў СВК. |
| Жнівень 1988 г. | Пачаўся рэгулярны трамвайны рух у Мазыры. |
| Студзень 1989 г. | Пачала дзейнічаць Мазырская агароднінная фабрыка. |
| 31 верасня 1989 г. | Адбыўся марш-пратэст «Чарнобыльскі шлях» і мітынг жыхароў Мазыра. |
| 1990 г. | Пабудаваны другі мост цераз Прыпяць каля в. Навікі. |
| 1991 г. | Пабудавана сярэдняя школа № 14 у Мазыры. |
| 1993 г. | Мазырскі філіял праектнага інстытута «Гомельграмадзянпраект» пераўтвораны ў самастойны праектны інстытут «Палессепраект». |
| 1994 г. | Пабудавана сярэдняя школа № 15 у Мазыры. |
| 1994 г. | Пачата перапрафіліраванне завода кармавых дражджэй. |
| 19 студзеня 1995 г. | Асвечана Свята-Мікалаеўская царква ў Мазыры. |

14996
Мозырская
городская ЦБС